# «СТАЛОВАЯ Ў ВАС ЁСЦЬ?»

## Не ўмееце — навучым

Па назіраннях сталічнай службы занятасці, 70 працэнтаў беспрацоўных арыентаваны на рабочыя прафесіі. На кірмашы можна было знайсці шмат прыдатных прапаноў. Так, хлебазаводу № 2 патрабуюцца пекар, фармоўшчык цеста, укладчык. Заробкі — ад 500 да 700 рублёў. «Керамін» сваім супрацоўнікам гатовы плаціць больш — 800—900 рублёў. Па некаторых спецыяльнасцях — кантралёр-прыёмшчык вырабаў, апраўшчык-чысцільшчык — на заводзе можна прайсці навучанне.

— Яно цягнецца месяц-паўтара, — удаецца ў дэталі кадравік. — Аплата працы ў гэты час будзе, але, вядома, у меншым памеры — каля 300 рублёў. Адзіны мінус — гэтыя прафесіі цяжкія фізічна, бо звязаны з вытворчасцю вырабаў. Унітаз можа важыць 30 кілаграмаў!

Арганізаваць навучанне, калі трэба, гатова і прадпрыемства «Белмедпрэпараты». Напрыклад, па такіх спецыяльнасцях, як апаратчык стэрылізацыі, дазіроўшчык медыцынскіх прэпаратаў. Заробкі абяцаюць ад 480—560 рублёў.

Мінскі падшыпнікавы завод набірае кавалёў на молатах і прэсах (калі маеце чацвёрты-пяты разрад, будзеце атрымліваць ад 800 рублёў у месяц), токараў (на тыя ж грошы), шліфоўшчыкаў (ад 600 рублёў), фрэзероўшчыкаў (800—900 рублёў).

Ёсць прапановы і для некваліфікаванай працы. Бадай, самая папулярная вакансія — прыбіральшчык. Плацяць няшмат — ад 300 да 400 рублёў. У 12-ю гарадскую клінічную стаматалагічную паліклініку неабходны санітарка і дворнік.

— Вакансіі хутка закрываюцца, так што думайце, — кажа прадстаўнік медустановы мужчыну, які зацікавіўся прапановамі.

— А сталовая ў вас ёсць? — пытаецца той.

— Ёсць абсталяваны пакой прыёму ежы.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## Калі ўзрост — перашкода

Кадраў не хапае ў гандлі. Так, гандлёвы дом «Палессе» шукае прадаўца, кантралёра-касіра, кухара, кандытара. Прапануюць 500—600 рублёў у залежнасці ад разраду. У гіпермаркетах Prostore гатовы плаціць на 100—200 рублёў больш. «Графік — два праз два, 12-гадзінная змена. Ёсць магчымасць падпрацоўкі для студэнтаў: аплата пагадзінная, час работы яны самі выбіраюць», — расказвае прадстаўнік сеткі.

У ЦУМе, акрамя прадаўца, неабходны кладаўшчык, грузчык і ахоўнік. Заробкі — каля 600 рублёў. З бонусаў — зніжка на абеды 30—40 працэнтаў у месцах грамадскага харчавання ўнівермага.

Адна з жанчын цікавіцца ў наймальнікаў вакансіямі бухгалтара.

— Я ездзіла ў Маскву, дапамагала дачцэ, толькі нядаўна ў Мінск вярнулася, — дзеліцца яна. — Па адукацыі я таваразнаўца, але вопыт бухгалтара ёсць. Пра заробак не думала — галоўнае, работу знайсці. Шмат адмоў атрымлівала. Мне 51 год, многія не хочуць браць з-за ўзросту — так адкрыта і кажуць. Хоць там, куды звярталася, дагэтуль бухгалтары патрабуюцца.





На кірмашы жанчына ўсё ж зацікавіла аднаго з работадаўцаў — яе запісалі на заўтра на гутарку.

Пра складанасці пошуку працы ў тых, каму «за», казала і іншая саіскальніца. Іне 52, мае дыплом інжынера-будаўніка. Праўда, па спецыяльнасці даўно не працавала, таму разглядае для сябе розныя варыянты. «Хацелася б, вядома, у офісе сядзець, але хто возьме? У аб'явах пішуць, што патрэбны кандыдаты да 40 гадоў... Тут знайшла для сябе вакансію прасавальшчыцы. Так, заробак невялікі — а што рабіць?» — уздыхае.

## Шукаем тактоўных і ўраўнаважаных

Актыўна набірае працоўныя рукі сфера будаўніцтва. На «Мапідзе» адкрыта каля 50 вакансій — як тэхнічных, так і інжынерных. Прадпрыемства «КСП-92», якое займаецца адстройвальнымі работамі, запрашае маляроў, тынкоўшчыкаў, сталяроў, abліцоўшчыкаў.

— Робім кватэры пад ключ, усе аб'екты па Мінску. Заробак своечасовы, — падкрэслівае кадравік. — Рабочыя ў нас атрымліваюць ад 800 да 1500 рублёў у залежнасці ад кваліфікацыі. Заказы ёсць заўсёды.

Некаторыя саіскальнікі прыходзяць на кірмаш адразу з працоўнымі кніжкамі. «Дрэнныя артыкулы ў працоўнай ёсць? У міліцыі на ўліку былі?» — пытаюцца прадстаўнікі прадпрыемстваў, перш чым запісаць кандыдата на гутарку.

— У мяне спецыяльнасцяў шмат. Слесар-рамонтнік, наладчык абсталявання — цэлы спіс, — усміхаецца немалады мужчына.

Фармальна ён мае працу — на заводзе. Праўда, завод цяпер прастойвае. «Цэлы месяц наогул ніякай работы! — скардзіцца гараджанін. — Атрымліваю 6,60 рубля ў дзень. Вось і палічыце мой заробак».

На кірмашы мужчына спадзяецца падабраць вакансію, дзе плацяць 600—800 рублёў у месяц. І пажадана работу ў адну змену — узрост усё ж такі.

Кіроўцы неабходны ў аўтобусны парк № 7. Ахвотных папярэджваюць: умовы працы нялёгкія. Затое грошы добрыя: тым, хто ездзіць у горадзе, абяцаюць 1300 рублёў, на прыгарадных маршрутах — 1100. «Мінсктранс» запрашае кантралёраў. Сярэдні заробак — 680 рублёў. З патрабаванняў — агульная сярэдняя адукацыя, а таксама ветлівасць, тактоўнасць і ўраўнаважанасць.

Усяго ў сталіцы налічваецца больш за 17 тысяч вакансій. У большасці выпадкаў (57 працэнтаў) прапануюць ад 400 да 800 рублёў у месяц. Чвэрць свабодных рабочых месцаў з заробкамі да 400 рублёў. На кожнай шостай вакансіі гатовы плаціць ад 800 да 1500 рублёў, больш за 1500 рублёў — толькі ў 1 % прапаноў.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
**Фота Ганна ЗАНКАВІЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## У ЗША выпрабавалі новую ядзерную зброю



У ЗША прайшлі выпрабаванні новай мадэрнізаванай шматфункцыянальнай ядзернай бомбы B61-12, паведамляе выданне The National Interest. Выданне піша, што «B61-12 дазваляе наносіць розныя тыпы ўдараў: з пранікненнем у зямлю і над паверхняй, высокай і нізкай магутнасці, а таксама можа выкарыстоўвацца для разбурэння падземных бункераў». Дакладнасць удару павышана за кошт новага «хваставога апярэння, а таксама інерцыйных навігацыйных сістэм». Як паведамляе дырэктар інфармацыйнага праекта аб ядзерных узбраеннях Федэрацыі амерыканскіх навукоўцаў Ганс Крыстэнсен, B61-12 валодае функцыямі ядзерных бомбаў B61-7 (магутнасцю 10—360 кілатон), B61-11 (400 кілатон для наземных удараў) і B83-1 (выкарыстоўваецца для разбурэння падземных бункераў), але з меншай колькасцю радыеактыўных ападкаў і «больш эфектыўнай сістэмай паражэння».

## Пенсійны ўзрост у Японіі плануюць падняць да 70 гадоў

Урад Японіі мае намер падняць планку пенсійнага ўзросту ў краіне да 70 гадоў замест цяперашніх 65 гадоў для працягу эканамічнага росту ва ўмовах хуткага «старэння» насельніцтва. Аб гэтым паведаміла інфармагенцтва «Кіёда Цусін» са спасылкай на праект даклада спецыяльнай камісіі па гэтым пытанні. Па даных агенцтва, ідэі павелічэння пенсійнага ўзросту будуць разгледжаны 26 лістапада на пасяджэнні Савета па эканамічнай і фінансавай палітыцы, каб да наступнага лета падрыхтаваць канкрэтны план. Законапраект аб павелічэнні пенсійнага ўзросту мяркуецца падрыхтаваць у 2020 годзе, ён будзе ўлічваць розныя ўмовы працоўнай дзейнасці, напрыклад скарочаныя працоўныя дні, выкананне дыстанцыйнай працы з дому, выдзяленне субсідый кампаніям за наём пажылых супрацоўнікаў. Як вядома, сярэдняя працягласць жыцця ў Японіі складае ў мужчын звыш 80 гадоў, а ў жанчын — звыш 87. Паводле даных японскага ўрада, кожнаму чацвёртаму жыхару краіны больш за 65 гадоў.

## Пад Антарктыдай знайшлі загадкавую зону

Міжнародная група навукоўцаў высветліла, што пад Усходняй Антарктыдай размяшчаецца крыніца геатэрмальнай энергіі, якая можа спрыяць раставанню ледавіковага шчыта. Пра гэта паведамляе выданне Science Alert. Вынікі радыёлакацыйнага зандзіравання, якое дазволіла выявіць працэсы пад трохкіламетровай тоўшчай лёду, паказваюць, што лёд у гэтай зоне плавіцца знізу ўгору, а адталая вада сцякае ў падлёднае возера. Працэс раставання можа працягвацца тысячы ці мільёны гадоў, і сам па сабе ён не ўплывае на знікненне ледзянога покрыва. Аднак у будучыні можа зрабіць рэгіён больш адчувальным да наступстваў глабальнага пацяплення. На думку спецыялістаў, найбольш магчымымі крыніцамі цяпла з'яўляюцца радыеактыўныя пароды і гарачая вада, якая вывяргаецца з глыбінь зямной кары.


Центр Промышленной Оценки
- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

**Извещение о проведении повторного аукциона**

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 | | |
| **Продавец** | Унитарное предприятие «Слуцкий рынок ОПС», г. Слуцк, пл. Базарная, 13 | | |
| **Предмет аукциона** (одним лотом) | | | |
| Наименование | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес (номер дома) |
| **Месторасположение предмета аукциона:** Минская обл., Слуцкий р-н, **г. Слуцк**, ул. Максима Богдановича | | | |
| **Здание кирпичное** | 40,4 кв. м | 640/С-84557 | д. 136А/1 |
| **Здание склада** | 286 кв. м | 640/С-84559 | д. 136А/2 |

**Сведения о земельном участке**: пл. 0,1009 га, предоставлен продавцу на праве аренды сроком по 10.01.2033 г. для содержания и обслуживания зданий. Ограничения прав: водоохранная зона реки Случь, площадь 0,1009 га

**Начальная цена с НДС 20 % – 36 416,00 бел. руб.**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 15** рабочих дней после проведения аукциона

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, условия оплаты предмета аукциона, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 11.10.2018

**Дата и время проведения аукциона: 21.12.2018** в **11.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703. **Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 20.12.2018 до 17.00** по указанному адресу. **Тел.: +375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. Email: auction@cpo.by**



Центр Промышленной Оценки
- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

**Извещение о проведении повторного аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Минскагротранс», г. Минск, ул. Бабушкина, 29, п/у Колядичи |

**Предмет аукциона**

**Имущество, реализуемое одним лотом, расположенное по адресу: Минская обл., г. Столбцы, ул. 17 Сентября, 59, в составе**

**Автомастерская** (здание нежилое), инв. номер **622/С-5578**, общ. пл. **277,1** кв. м

**Здание вспомогательное** (здание специализированное иного назначения), инв. номер **622/С-36385**, общ. пл. **37,5** кв. м

**Мастерская** (здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т. ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции)), инв. номер **622/С-5576**, общ. пл. **786,6** кв. м, в т. ч. кирпичный забор, асфальтобетонное покрытие

**Контрольно-пропускной пункт** (здание нежилое), инв. номер **622/С-5574**, общ. пл. **158,8** кв. м, в т. ч. смотровая яма, ворота металлические, ограждение металлическое

**Пристройка кирпичная** (здание специализированное иного назначения), инв. номер **622/С-36384**, общ. пл. **3,8** кв. м

**Линия электропередачи** (сооружение специализированное энергетики), инв. номер **622/С-46452**, протяженность **82,9** м

**Туалет кирпичный** (здание специализированное иного назначения), инв. номер **622/С-36386**, общ. пл. **2,4** кв. м

**Водопровод** (сооружение специализированное водохозяйственного назначения), инв. номер **622/С-46453**, протяженность **313,3** м

| | |
|---|---|
| **Сведения о земельном участке** | Земельный участок, общ. 1,1000 га, предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания производственной организации г. Столбцы ул. 17 Сентября, 59 |
| **Начальная цена с НДС 20 %** | 227 156,10 белорусских рублей (снижена на 20 %) |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **15** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 03.09.2018

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **06.12.2018** в 14.00мин по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **04.12.2018** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** |



**ОАО «СПЕЦМОНТАЖСТРОЙ» извещает своих акционеров (их представителей) о проведении 5 декабря 2018 г. внеочередного общего собрания по адресу: г. Минск, ул. Володько, 20, каб. 35**

**ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ**

1) О досрочном прекращении закрытой подписки на акции дополнительного выпуска Общества.

2) Об утверждении результатов размещения дополнительного выпуска акций Общества.

3) Об утверждении решения о выпуске акций.

4) О внесении изменений и дополнений в Устав Общества и их утверждении.

Место проведения собрания по месту нахождения ОАО «СПЕЦМОНТАЖСТРОЙ»: г. Минск, ул. Володько, 20, каб. 35.

Начало работы собрания в 18.00.

Регистрация участников собрания с 17.00 до 17.45 в день проведения собрания. Акционеру при себе иметь документ, удостоверяющий личность, представителю акционера – документ, удостоверяющий личность, доверенность или договор.

Список акционеров для регистрации участников собрания будет составлен по данным реестра владельцев ценных бумаг по состоянию на 30 ноября 2018 г.

С материалами по вопросам повестки дня собрания можно ознакомиться в рабочие дни (понедельник–пятница) с 14.00 до 17.00, начиная с 23.11.2018, по месту нахождения Общества.

Орган, созывающий общее собрание: наблюдательный совет, основание созыва: протокол от 22.11.2018 № 11/2018.

Наблюдательный совет ОАО «СПЕЦМОНТАЖСТРОЙ»

УНП 100036332